

За чысты Моталь!



Выяўлена астма? Рыхтуйцеся да прастуд

СТАР.3



Рубель пайшоў ад грыўні

СТАР.6


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 СНЕЖНЯ 2015 г. СЕРАДА № 238 (28096) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з афіцыйным візітам у В'етнам

Сёння Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам В'етнама Чыонг Тан Шангам, сустрэнецца з генеральным сакратаром Камуністычнай партыі Нгуен Фу Чонгам і прэм'ер-міністрам Нгуен Тан Зунгам.




# «ЛЕДЗЯНЫ ПАКОЙ» ДЛЯ СВЯТОЧНАГА НАСТРОЮ



Фота Надзеі БУЖАН.

**У апошні час Новы год і папярэднія яму тыдні ў многіх беларусаў перасталі асацыявацца з маразамі, снегам і льдом. Усё часцей снежань прыносіць толькі халодныя дажджы і слоту. Але зарадзіцца перадкнавагоднім настроем нават у такое надвор'е жыхарам сталіцы цяпер стане прасцей — у гандлёвым цэнтры ALL на Даўгінаўскім тракце з'явіўся так званы «ледзяны пакой», у якім пара года не залежыць ад навакольнага асяроддзя.**

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ПРАКАПОВІЧ, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

*«Сёння, ва ўмовах знешняга крызісу, калі мы не можам разлічваць на тое, што нешта ў свеце рэзка зменіцца, ды яшчэ ў наш бок, трэба востра ставіць пытанне аб павелічэнні ўнутранага попыту за кошт беларускіх тавараў і паслуг. Мы павінны правільна развіваць беларускі рынак. Калі мы заваюем яго, мы аўтаматычна заваюем і рынак усяго ЕАЭС, таму што ўсё, што трэба нам, трэба і там — і ў вялікіх аб'ёмах».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 3° |
| Віцебск | + 1° |
| Гомель | + 2° |
| Гродна | + 3° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 2° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18260,00 | ▲ |
| Еўра | 19839,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 263,29 | ▼ |
| Укр. грыўня | 793,05 | ▲ |

# УДЗЯЧНАСЦЬ ЗА СУМЛЕННУЮ ПРАЦУ

**Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам працоўных калектываў.**

«Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі я ўручаю заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў нашай краіны. Гэтых узнагарод вы ўдастоены за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік урада падкрэсліў, перадае карэспандэнт БЕЛТА, што асаблівую ўвагу Прэзідэнт надае харчовай бяспецы. Таму працаўнікі вёскі складаюць значную частку сярод узнагароджаных. «З задавальненнем адзначу, што за пяць гадоў уведзена ў эксплуатацыю і тэхнічна пераасняшчана больш за тысячу малочнатаварных комплексаў. Прадукцыя вёскі стала важным экспартным артыкулам краіны. Толькі за апошнюю пяцігодку экспарт харчовых тавараў склаў $25 млрд. Асвойваюцца новыя рынкі збыту», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Высокімі ўзнагародамі адзначана праца прадстаўнікоў нафтахімічнай і газавай галін, якія забяспечваюць рэспубліку высакаякаснымі нафтапрадуктамі і неабходнымі энерганосьбітамі. Сярод узнагароджаных і медыцынскія работнікі. Асобную ўдзячнасць ён выказаў групе ўзнагароджаных за значны ўклад у стварэнне і развіццё Еўразійскага эканамічнага саюза. Словы ўдзячнасці ён адрасаваў таксама вучоным, выкладчыкам, настаўнікам. Дзяржаўныя ўзнагароды былі ўручаны таксама вялікай групе работнікаў лясной гаспадаркі. Уклад мастакоў у развіццё нацыянальнага мастацтва, духоўнае і эстэтычнае выхаванне грамадзян таксама адзначаны на высокім узроўні. Усяго дзяржаўныя ўзнагароды з рук кіраўніка беларускага ўрада сёння атрымалі больш як 100 чалавек.




# АДВАРОТНЫ БОК НАВАГОДНІХ «СПЕЦЭФЕКТАЎ»

**Зусім хутка пачнецца сезон «артылерыйскіх кананад» на вуліцах — зімовыя святы ў нас многія любяць адзначаць вельмі гучна. Хоць лік пацярпелых ад піратэхнікі штогод вымяраецца дзясяткамі, гэта не спыняе аматараў спецэфектаў. Карэспандэнт «Звязды» распытаў памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях Віталя Навіцкага пра тое, як жа бяспечна абыходзіцца з піратэхнікай і чым заканчваецца нават нязначнае адступленне ад правілаў яе выкарыстання.**

## НА БАЛЬНІЧНЫ ЛОЖАК ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

Летась 12-гадовы хлапчук разам з сябрам набылі ў гомельскім кіёску петарды і пайшлі іх «выпрабоўваць» на школьным двары. На яе тэрыторыі пабудавана газаразмеркавальная падстанцыя, на некаторай адлегласці ад якой быў выкапаны тэхналагічны калодзеж, дзе змяшчалася запорная газавая арматура. У люку, які закрываў гэты калодзеж, былі прасвідраваны невялічкія дзіркі для вентыляцыі на выпадак уцечкі газу. Двое падлеткаў не прыдумалі нічога лепшага, як запусціць у гэты калодзеж петарду. Тут жа раздаўся выбух, хваля ад якога шпурнула металічнае века ад калодзежа на паўтара метра — якраз у бок аднаго з хлопцаў, якога і даставілі пасля ў абласную бальніцу з апёкамі твару і чэрапна-мазгавой траўмай.

— Колькасць пажараў з-за піратэхнікі штогод зніжаецца. А вось няшчасных выпадкаў ад яе няправільнага выкарыстання менш не становіцца. І пакутуюць ад гэтага не толькі дзеці, але і дарослыя.



Шумна адзначыць навагоднюю ноч вырашыў жыхар Рагачова. Ён запусціў петарду, але не разлічыў, і піратэхніка стрэліла чалавеку прама ў твар. Скончылася гэта апёкамі першай ступені скуры, пашкоджаннем рагавіцы левага вока. У цяжкім стане небараку шпіталізавалі ў Гомельскую абласную бальніцу.

## КІТАЙСКАЯ ГРАМАТА «ШЭРАЙ» ПІРАТЭХНІКІ

Год ад года ратаўнікі разам з міліцыянерамі праводзяць рэйды па гандлёвых пунктах, дзе прадаецца піратэхніка. Але прапанаваць купіць яе з рук могуць дзе заўгодна. Напрыклад, летась да аўтара гэтых радкоў «падкацілі» з такой прапановай напярэдадні Новага года на аўтастаянцы ля аднаго са сталічных гіпермаркетаў. Праўда, пачуўшы прамым тэкстам у адказ, што я не збіраюся купляць невядома што незразумела ў каго, незадачлівы гандляр да мяне цікавасць рэзка страціў.

СТАР. 2

■ Па той бок прылаўка

# СВАБОДНАЯ КАСА!

## Сітуацыя з напаўняльнасцю ў гандлёвых цэнтрах пад кантролем

**Паводле інфармацыі Міністэрства гандлю, зараз узровень фактычнага выкарыстання гандлёвых месцаў у гандлёвых цэнтрах складае каля 80 працэнтаў. Пры гэтым сярэдні кошт арэнды квадратнага метра з пачатку года знізіўся на 30 працэнтаў і складае каля 20 еўра.**

У тых умовах, якія складваюцца, уласнікі плошчаў прымаюць актыўныя захады па прыцягненні арандатараў. Часам пры заключэнні дагавора арэнды па першым часе плата зусім не бярэцца, аплачваюцца толькі камунальныя плацяжы, гавораць у міністэрстве.

З мэтай карэкціроўкі сітуацыі, павелічэння долі тавараў айчыннай вытворчасці ў рознічным таваразвароце Міністэрства гандлю выйшла з прапановай ва ўрад устанавіць для індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб, незалежна ад формы ўласнасці, якія вядуць выключна рэалізацыю тавараў айчыннай вытворчасці, выкарыстанне да базавай стаўкі арэнднай платы паніжальных каэфіцыентаў (0,4 і 0,5).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



## Рэкордныя паводкі ў Англіі звязаны з глабальным пацяпленнем

Зацяжныя ліўні ў Вялікабрытаніі выкліканы анамаліямі ў заходняй частцы Ціхаакіянскага рэгіёна, дзе ў апошні час таксама значна пачасціліся дажджы. Пра гэта заявілі ў Галоўнай метэаралагічнай службе Злучанага Каралеўства. Прычынай апошніх можа быць больш хуткае, чым раней, раставанне арктычных ільдоў. У мястэчку Тырлмер у графстве Камбрыя, найбольш пацярпелым ад паводкі, менш чым за двое сутак выпала 405 мм ападкаў, што амаль у два разы вышэй за месячную норму. Усяго за апошнія дні затопленымі аказалася больш за 5 тыс. дамоў па ўсёй краіне, каля 60 тыс. засталіся без электрычнасці. Закрыта большасць аўтамагістраляў, перапынены чыгуначныя зносіны з Шатландыяй. Стыхія прывяла да эвакуацыі тысяч жыхароў паўночнага захаду Англіі, сама меней два чалавекі загінулі.

## Турцыя адмовілася вывесці войскі з Ірака

Анкара не будзе выводзіць з Ірака свае ваенныя падраздзяленні. Пра гэта паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на заяву неназванага прадстаўніка турэцкага ўрада, зробленую заходнім журналістам у Стамбуле. У сваю чаргу віцэ-прэм'ер Турцыі Нуман Куртулмуш на брыфінгу ў Анкары заявіў пра павагу Турцыі да тэрытарыяльнай цэласнасці Ірака. Ён патлумачыў ваенную прысутнасць сваёй краіны на тэрыторыі суседа тым, што гэтая мера «накіравана супраць ІД, што супадае з інтарэсамі Ірака». 4 снежня стала вядома, што батальён турэцкіх салдат размешчаны на поўначы Ірака паблізу захопленага «Ісламскай дзяржавай» горада Масул. Войскі забяспечаны бранятэхнікай. Афіцыйная мэта місіі — падрыхтоўка мясцовага апалчэння для баёў з ІД. МЗС Ірака кваліфікаваў дзеянні Турцыі як уварванне. Багдад адхіліў магчымасць правядзення няўзгодненай ваеннай аперацыі і запатрабаваў неадкладнага вываду турэцкіх войскаў.



### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## Спажыванне бульбы можа знізіць рызыку раку страўніка



Новае даследаванне паказала: уключэнне ў рацыён вялікай колькасці белай гародніны, такой як бульба, цыбуля і капуста, можа знізіць верагоднасць раку страўніка на трацiну. А піва, спіртныя напоі, соль і кансервы павялічваюць рызыку анкалогіі. Навукоўцы з Універсітэта Чжэцзян праанalізавалі вынікі 76 даследаванняў аб сувязі дыеты і раку страўніка. У эксперыменце ўдзельнічалі больш як 6,3 мільёна чалавек. Навукоўцы выявілі: кожныя 100 грамаў садавіны (эквівалентна прыкладна палове яблыка), якія людзі з'ядалі штодня, зніжалі рызыку на 5%. Спажыванне 50 міліграмаў вітаміну С, што адпавядае дзвюм бульбінам, змяншала верагоднасць анкалогіі на 8%. У той жа час кожныя 5 грамаў (чайная лыжка) солі павялічвалі верагоднасць раку на 12%.

### КОРАТКА

Рускі біяграфічны інстытут прысудзіў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку званне «Чалавек года — 2015» ў намінацыі «Міжнародныя адносіны» за ўмацаванне еўразійскага супрацоўніцтва і плённае супрацоўніцтва з Расіяй.

**Беларусь і В'етнам у рамках двухбаковага бізнес-форуму, які праводзіцца ў Ханоі, падпісалі амаль два дзясяткі дакументаў на пастаўку беларускай прадукцыі на $24 млн.**

Рымска-каталіцкая царква ў Беларусі пакуль не ведае, хто заменіць апостальскага нунцыя архіепіскапа Клаўдыа Гуджэроці, які завяршае сваё служэнне ў краіне.

**Запрашаць у дзіцячыя садкі на навагоднія ранішнікі прыватнага Дзеда Мароза можна толькі па ўзгадненні з кіраўніцтвам установы і бацькоўскім камітэтам.**

Гала-канцэрт «зорак» сусветнай оперы, які пройдзе 20 снежня ў час VI Мінскага міжнароднага Калядняга опернага форуму, збярэ вакалістаў 15 тэатраў з 14 краін.

**Прызавы фонд мінскага чэмпіянату Еўропы па шахматах па бліцы і рапідзе складзе больш як 30 тыс. еўра. Шахматысты з 31 краіны падалі заяўкі на ўдзел, у бліцы выступяць 675 спартсменаў, у рапідзе — 802.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# КАБ НЕ ЗАБЫЦЬ МАТЧЫНА СЛОВА



**Іван КЛІМКО, начальнік цэха па вытворчасці чмялёў, пчол і апыленні сельскагаспадарчых культур унітарнага прадпрыемства «Агракамбінат Ждановічы»:**

— Са «Звяздой» я сябрую яшчэ з савецкіх часоў. Перавагу аддаю менавіта гэтай газеце, бо яна выходзіць на беларускай мове і не дае магчымасці яе забываць. Я родам са Стаўбцоўшчыны. У школе ў нас выкладала родную мову настаўніца, якой я вельмі ўдзячны за тое, што навучыла шанаваць матчына слова, слова маіх продкаў, якія спакон веку жылі на Стаўбцоўскай зямлі. Зямлі, якая дала краіне, свету славутага пісьменніка Якуба Коласа.

Падабаецца, што «Звязда» паважае свайго чытача, не дазваляе сабе вольнай трактоўкі падзей: толькі аб'ектыўная інфармацыя, абгрунтаваныя факты. А калі падымаецца нейкая праблема, то газета дае магчымасць выказацца ўсім, каго яна тычыцца. Так бы мовіць, даследуе пытанне з розных бакоў, не навязвае чытачу нейкія аднабаковыя погляды.

Хочацца, каб больш увагі любімая газета звяртала і на галіну пчалярства ў Беларусі, яе праблемы, перспектывы развіцця. Сёння ў гэтым кірунку працуе шмат грамадскіх арганізацый, але яны разрозненыя, і кожная з іх цягне, так бы мовіць, коўдру на сябе. На маю думку, павінна быць агульная палітыка, як на ўзроўні пчаляроў, так і на ўзроўні дзяржавы.

Мне здаецца, што «Звязда» павінна таксама асвятляць усё самае лепшае ў розных сферах жыццядзейнасці, прапагандаваць перадавы вопыт, што дапаможа стаць больш заможнымі як людзям, так і краіне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І паўгоддзе 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.